**Л.В.Снапкова,** *ст.выкладчык*

# САМАСТОЙНАЯ РАБОТАСТУДЭНТАЎ ПРЫ НАВУЧАННІ СОЛЬНЫМ СПЕВАМ

Навучанне ў класе сольных спеваў мае практычны характар. Звесткі аб рабоце галасавога апарату, якасці вакальнага гучання, спосабах яе дасягнення, законах музычна-вакальнага выканання студэнт атрымлівае ў працэсе спеваў і авалодання вакальнымі навыкамі.

Выхаванне пеўчага навыку патрабуе частых, сістэматычных практыкаванняў у фазе яго фарміравання і замацоўвання.

Частковае перанясенне абавязковых тэхнічных практыкаванняў у самастойную работу студэнта робіць хутчэйшым тэмп навучання, павышае ступень авалодання вакальнымі навыкамі, вызваляе час на занятках для паглыблення вакальнай падрыхтоўкі.

Некаторыя выкладчыкі недаверліва адносяцца да самастойнай работы студэнтаў пры навучанні сольным спевам. Асноўнымі прычынамі гэтага з'яўляюцца:

— недастатковае разуменне яе ролі ў вакальна-навучальным працэсе, у выхаванні асобы спевака;

— адсутнасць у літаратуры поўных даных аб псіхолага-педагагічнай значнасці гэтага віду вучэбнай дзейнасці;

— адсутнасць метадычных распрацовак.

Пры вакальным навучанні шмат часу даводзіцца ўдзяляць выпраўленню прыродных ці набытых недахопаў голасавядзення. Паспяховае і хуткае іх выкараненне магчыма толькі пры пастаянным самакантролі, што забяспечвае самастойная работа. З гэтай мэтай у дамашнія заданні студэнта ўключаюцца неабходныя практыкаванні, якія дапамагаюць развіваць цяжка засваяльныя навыкі. Да іх адносяцца практыкаванні па выраўноўванні галосных, выпрацоўцы

БИБЛИОТЕКА БГУКИ

дакладнай дыкцыі, згладжванні рэгістраў, авалоданні правільным пеўчым дыханнем.

Дзякуючы самастойнай рабоце вучэбная дзейнасць студэнтаў становіцца штодзённай і ператвараецца ў бесперапынны працэс. Толькі ў практычнай самастойнай дзейнасці студэнты змогуць навучыцца карыстацца набытымі ведамі і навыкамі, прымяняць іх у сваёй працы. Таму самастойная работа ў класе сольных спеваў дапамагае наблізіць вакальнае навучанне да практыкі. Выкладчыку гэта дае магчымасць аператыўна і правільна арыентаваць студэнта, выяўляць недахопы і дасягненні ў вучэбнай дзейнасці, што стымулюе заняткі, актывізуе пазнавальны працэс.

Назіранне за выкананнем самастойных заданняў, улік дасягненняў і недахопаў у дамашняй рабоце дазваляюць выкладчыку зрабіць пэўныя вывады і на іх падставе пры неабходнасці гібка змяніць методыку навучання, унесці ў яе адпаведныя змены. Гэта стварае ўмовы для бесперапыннага ўдасканальвання вучэбнага працэсу, павышэння яго эфектыўнасці.

Кожнаму вучэбнаму прадмету ўласцівы свае спецыфічныя асаблівасці ў самастойнай рабоце. Але ў цэлым арганізацыя самастойнай работы падпарадкоўваецца агульным заканамернасцям.

Падрыхтоўчая самастойная работа стварае спрыяльныя ўмовы для набыцця вакальных навыкаў на занятках. Да яе можна аднесці развучванне музычна-літаратурнага тэксту новага твора; самастойнае расяпяванне; розныя практыкаванні, якія накіраваны на вызваленне ці ўмацаванне мышцаў галасавога апарату (артыкуляцыйных ці дыхальных органаў) у пачатку навучання.

Трэніровачная самастойная работа дапамагае замацаванню і развіццю вакальных навыкаў. Да яе адносяцца, у прыватнасці,

БИБЛИОТЕКА БГУКИ

разнастайныя практыкаванні, накіраваныя на вырашэнне вакальна-тэхнічных і мастацкіх задач.

Вельмі важнай для выяўлення вакальных навыкаў і ведаў з'яўляецца кантрольная работа. Форма яе — самастойная падрыхтоўка студэнтамі практыкаванняў, музычных твораў з метадычным разборам.

Асобна трэба звярнуць увагу на самастойнае распяванне. Значэнне гэтага ўмення цяжка пераацаніць. Для работы галасавога апарату студэнт павінен быць "распетым". Вельмі важная і штодзённая ранішняя галасавая зарадка, якая дапамагае настроіць голас, прывесці яго ў рабочы стан, што дазваляе скараціць час на "разагрэў" голасу і выкарыстаць яго для работы над тэхнічнымі і мастацкімі задачамі.

Комплекс практыкаванняў, якія студэнт ужывае для самастойнага распявання, павінен быць падабраны ці правераны і адобраны выкладчыкам. Яго трэба складаць, зыходзячы з індывідуальных асаблівасцей голасу і этапаў яго развіцця. У самастойнае распяванне ўключаюцца толькі тыя практыкаванні, якія цвёрда засвоены студэнтам і на якіх ён дасягнуў найлепшага гучання. Падбіраць практыкаванні неабходна з улікам выхавання ў студэнтаў асноўных вакальна-тэхнічных задач: арганізацыі апоры гуку і дыхання; дакладнай дыкцыі; узнаўлення патрэбнай атакі гуку; высокага па пазіцыі і роўнага гучання.

Эфектыўнасць самастойнай работы залежыць ад методыкі яе арганізацыі. Яна павінна быць працягам работы на занятках. Змест дамашніх заданняў неабходна будаваць так, каб студэнт пры іх выкананні абапіраўся на вакальныя навыкі і веды, набытыя на занятках. Неад'емнай часткай эфектыўнасці самастойнай работы з'яўляецца паступовае ўскладненне зместу заняткаў (ад простага да складанага, ад лёгкага да цяжкага).

Выкладчык павінен звярнуць увагу студэнта на важнейшыя моманты і цяжкасці дамашняга задання, праверка якога

БИБЛИОТЕКА БГУКИ

адыгрывае вялікую ролю ў эфектыўнасці самастойнай работы. Праверка ўключае вызначэнне якасці выканання, выяўленне памылак і аналіз іх прычын з указаннем спосабаў выпраўлення. Самастойнасць студэнта праяўляецца ў адказным выкананні дамашняга задання, у выпраўленні памылак і ў складанні плана сваёй будучай работы.

Абавязковай умовай прадуктыўнай самастойнай работы навучэнца па сольных спевах з'яўляецца вядзенне ім дзённіка. У ім запісваюцца мэта, змест, спосаб выканання, асноўныя моманты і цяжкасці, на якія трэба звярнуць асаблівую ўвагу пры выкананні задання.

Мы павінны рыхтаваць студэнта да яго будучай прафесійнай дзейнасці так, каб ён, скончыўшы універсітэт, мог паспяхова спраўляцца з задачамі, што паўстануць перад ім у жыцці. А паспяховае навучанне сольным спевам немагчыма без актыўнай працы навучэнца, яго волі і свядомага выканання дзеянняў, якія неабходны для авалодвання вакальнымі навыкамі. Такім чынам, самастойная праца студэнта з'яўляецца важным сродкам яго высокай прафесійнай падрыхтоўкі.

БІБЛІЯТЭКА БГУКИ